Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 СТУДЗЕНЯ 2019 г. АЎТОРАК № 13 (28880)

НАШЫ НА СУСВЕТНАЙ ЗІМОВАЙ УНІВЕРСІЯДЗЕ

З МІНСКА – ДА АЛЕНЯЎ У ТУНДРУ

ЦЫТАТА ДНЯ

Аксана НЯХАЙЧЫК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

«Сабраныя сродкі так званага транспартнага падатку цяпер паступаюць у дарожны фонд, адкуль яны размяркоўваюцца на будаўніцтва, эксплуатацыю і рамонт дарог. На сённяшні дзень 50 % «дарожнага збору» накіроўваецца на рэспубліканскія дарогі, 50 % — на мясцовыя. Прэзідэнт гаворыць пра тое, каб давесці да ладу мясцовыя дарогі. У залежнасці ад таго, як будзе ажыццяўляцца гэты збор, цалкам магчыма, што дастаткова будзе 25 % — у рэспубліканскі бюджэт, а 75 % пакідаць на мясцовыя дарогі».

КАРАТКА

• Вядомыя факеланосцы эстафеты агню II Еўрапейскіх гульняў пранясуць «Полымя міру» па месцах сваёй малой радзімы.

• Пасольства Польшчы ў Беларусі 21 студзеня адкрыла кнігу спачуванняў у сувязі з трагічнай смерцю мэра Гданьска Паўла Адамовіча.



• Ратавальнікі выцягнулі цяжарную ласіху, якая правалілася пад лёд на возеры Гомля ў Полацкім раёне.

• Беларусь уводзіць часовае ліцэнзаванне экспарту асобных відаў лесаматэрыялаў за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

ISSN 1990 - 763X

СЯМЕЙНЫ КАТОК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як толькі ўсталёўваюцца трывалыя маразы, у Чачэрску заліваюць хакейную каробку, пачынае працаваць пункт пракату канькоў. Гараджане з задавальненнем прыходзяць сюды адпачываць. Выбраліся пакатацца ў выхадны дзень і Калодзіны. Алена Васілеўна паказвае прыклад сваім дзецям і сама разам з імі вучыцца майстэрству катання. На гэтым здымку разам з матуляй усе дзеці Калодзіных — старэйшая дачка Вікторыя, сярэдні сын Максім і малодшы Ілья.

Падрабязнасці

Заробкі па новых правілах

Сістэма аплаты працы бюджэтнікаў стане прасцейшай

Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта ад 18 студзеня 2019 года № 27 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый». Сістэму ўжо праз год чакаюць комплексныя змены. Як будуць налічваць заробкі па новых правілах, растлумачылі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Пакуль дзейнічае 27-разрадная Адзіная тарыфная сетка работнікаў. Указ скароціць колькасць разрадаў да 18, розніца паміж каэфіцыентамі складзе не менш за 6 %. Новую тарыфную сетку ўрад зацвердзіць да 1 сакавіка 2019 года, а дзейнічаць яна пачне з 1 студзеня 2020-га.

Зменіцца велічыня, з якой вылічваюць аклады.

— Замест тарыфнай стаўкі першага разраду ўводзіцца базавая стаўка, памер якой плануюць наблізіць да бюджэту пражыткавага мінімуму, што дазволіць замацаваць тарыфную частку заработнай платы, — каментуюць у міністэрстве. — Памер базавай стаўкі будзе вызначацца ўрадам, як правіла, з 1 студзеня з улікам прагнозу асноўных параметраў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.

Базавую стаўку, якая будзе дзейнічаць з пачатку 2020 года, зацвердзяць да 1 сакавіка 2019-га.

Спросціцца структура заробку бюджэтнікаў. Ён будзе складацца з акладу, стымуляцыйных (надбаўкі, прэміі) і кампенсацыйных (даплаты) выплат. Памер гэтых выплат будзе вызначацца ад акладу ці базавай стаўкі. Розныя каэфіцыенты і павышэнні са складу заробку выключаць. А колькасць надбавак і даплат максімальна скароцяць.

СТАР. 3

Глыбінка

БОЛЬШ, ЧЫМ ДАПАМОГА

У Чавусах створана сістэма па падтрымцы людзей і чалавечых сувязяў

Клопат аб людзях паважнага ўзросту набывае ў нашым грамадстве асаблівае значэнне. Гэта выразна бачна ў глыбінцы, дзе колькасць занятых у эканоміцы няўмольна скарачаецца штогод. Разам з тым, тыя, хто параўнальна нядаўна выйшаў на пенсію, застаюцца актыўнымі, яны прагнуць чалавечых стасункаў і дзейнасці. І калі больш маладыя гатовы іх падтрымаць, то старасць у гэтых мясцінах атрымлівае адтэрміноўку, а жыхары набываюць больш цікавых і радасных дзён у сваім жыцці. Прычым усе — ад малога да старога.

Ад нараджэння да сталага веку

Так, падобна на тое, атрымліваецца ў Чавусах. І вялікая заслуга ў гэтым раённага Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Ён размяшчаецца ў будынку былога штаба даўно расфарміраванай воінскай часці. Зараз у Чавускім раёне пражывае 18 тысяч чалавек, траціну з іх складаюць пенсіянеры і інваліды. Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання працуе не толькі з апошнімі, але таксама з сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей, з тымі, хто аказаўся ў складанай жыццёвай сітуацыі, церпіць ад гвалту, вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, не мае жылля, работы і дакументаў.

— Можна сказаць, што Цэнтр абслугоўвае ўсе катэгорыі насельніцтва, — расказала **загадчыца аддзялення першаснага прыёму, аналізу, інфармавання і прагназавання Наталля МАНЫШАВА.** — Малазабяспечаныя звяртаюцца па матэрыяльную дапамогу, шматдзетныя атрымліваюць у нас пасведчанні, маладыя бацькі афармляюць сямейны капітал. Мы дапамагаем з рамонтам печаў і электраправодкі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, адзінокім людзям сталага ўзросту і інвалідам.

СТАР. 4

З СЯБРАМІ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ

Прэзідэнт прыняў даверчыя граматы паслоў 10 дзяржаў

Арменія, Аўстрыя, Бахрэйн, В'етнам, Гана, Канада, Туніс, Чарнагорыя, Чэхія і Сальвадор — дыпламаты з гэтых краін сустрэліся з Аляксандрам Лукашэнкам учора ў Палацы Незалежнасці.

ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ ЭКАНОМІКІ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

Кіраўнік дзяржавы сардэчна павітаў усіх паслоў і адзначыў, што пачатак іх дыпламатычнай місіі прыйшоўся на выдатны час, калі ў памяці яшчэ свежыя прыемныя ўспаміны пра светлыя святы. «Аднак мы ўжо ўключыліся ў імклівы тэмп новага працоўнага года. І я разлічваю на далейшае плённае супрацоўніцтва з вамі, — падкрэсліў беларускі лідар. — Наша краіна гатова да ўзаемадзеяння з Захадам і Усходам, Поўначчу, Поўднем, калі яно будуецца на прынцыпах павагі, шчырасці і прыстойнасці».

Паводле слоў Прэзідэнта, з улікам геастратэгічнага становішча Беларусь вельмі зацікаўлена ў міры, стабільнасці, неканфліктным і эфектыўным партнёрстве. Толькі шляхам раўнапраўнага дыялогу прыбіраюцца стэрэатыпы і разбураюцца пабудаваныя на іх падмурку сцены непаразумення.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што за нашай краінай ужо трывала замацаваўся статус аднаго з ініцыятараў і актыўных удзельнікаў інтэграцыйных працэсаў на еўразійскай прасторы. «Глыбока перакананы, што Мінск можа стаць месцам новага шырокамаштабнага дыялогу па пытаннях бяспекі дзяржаў у Еўра-Атлантыцы і Еўразіі. Мы будзем і надалей ініцыяваць міралюбныя праекты супрацоўніцтва, якія аб'ядноўваюць. І, вядома, падтрымліваць любыя добрыя пачынанні з вашага боку», — адзначыў ён.

Беларускі лідар таксама нагадаў, што сёння міжнародная сітуацыя імкліва змяняецца і часта яе складана спрагназаваць. Усё больш жорсткая канкурэнцыя ахоплівае сусветную эканоміку. У гэтых няпростых умовах усе дзяржавы імкнуцца выпрацаваць стратэгію супрацьстаяння традыцыйным і новым выклікам і пагрозам. Як паказвае практыка, рабіць гэта больш эфектыўна разам.

«Працуючы ў Беларусі, вы ўбачыце, што ў нашай краіне праводзяцца сур'ёзныя ператварэнні, асабліва ў эканоміцы. Увага акцэнтуецца на лібералізацыі гэтай сферы, а таксама стварэнні спрыяльнага інвестыцыйнага клімату і ўмоў для вядзення бізнесу», — расказаў прысутным кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, у нашу краіну прыцягваюцца з-за мяжы перадавыя тэхналогіі, але яны распрацоўваюцца і самастойна, пашыраюцца і дыверсіфікуюцца рынкі збыту айчыннай прадукцыі, якая славіцца сваімі высокімі стандартамі якасці.

Не менш важная ўвага ў Беларусі аддаецца развіццю адукацыі, навукі, медыцыны і спорту.

«Чалавечы капітал — гэта інвестыцыі ў будучыню нашай дзяржавы, залог яго поспеху і працвітання. У кожнай са згаданых сфер у нас назапашаны значны вопыт, якім мы можам падзяліцца з замежнымі сябрамі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

НАПРАМКІ — ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ

Беларускі лідар асобна спыніўся на развіцці адносін з кожнай з дзяржаў, чые паслы прысутнічалі на сустрэчы.

На думку кіраўніка дзяржавы, Арменія была і застаецца для Беларусі надзейным партнёрам, з якім нас звязвае шматпланавае супрацоўніцтва, у тым ліку ў Еўразійскім эканамічным саюзе і Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы.

«Мы нацэлены на пашырэнне гандлёва-эканамічнага складніка беларуска-армянскіх адносін і гатовы ўдзельнічаць у любых праектах, у тым ліку і на тэрыторыі Арменіі, якія зацікавяць нашых армянскіх сяброў і братоў», — заявіў ён.

Цесны дыялог з В'етнамам на ўсіх узроўнях спрыяе эфектыўнаму вырашэнню актуальных пытанняў двухбаковага парадку дня. На думку беларускага лідара, сёння неабходна сканцэнтравацца на забеспячэнні росту ўзаемнага гандлю і рэалізацыі сумесных праектаў у прамысловасці, нафтахіміі, будаўніцтве, адукацыі, інфармацыйных тэхналогіях.

«Мы зацікаўлены ва ўсебаковым і маштабным развіцці сувязяў з Бахрэйнам. Тым больш што пазітыўныя прыклады супрацоўніцтва з дзяржавамі Персідскага заліва ў нас ёсць», — адзначыў беларускі лідар. Што трэба зрабіць? Актывізаваць двухбаковы гандаль, аб'ём якога цяпер, на жаль, нязначны. Прэзідэнт падкрэсліў: мы прапануем бахрэйнскім партнёрам не толькі традыцыйныя тавары, але і высокатэхналагічную прадукцыю.

Паслядоўнае павышэнне ўзроўню і інтэнсіўнасці палітычных кантактаў з Аўстрыяй сведчыць аб новай якасці міждзяржаўнага ўзаемадзеяння. Прэзідэнт высока ацаніў намаганні Вены па зніжэнні напружанасці ў Еўропе і свеце, навядзенні мастоў паміж ключавымі геапалітычнымі гульцамі. Падыходы нашых краін тут сугучныя. Паводле яго слоў, Беларусь зацікаўлена ва ўмацаванні выгаднага і канструктыўнага супрацоўніцтва, перш за ўсё ў гандлёва-інвестыцыйнай сферы.

Гранічна адкрыты прагматычны дыялог усталяваны ў нашай краіны з Чэхіяй. Рэалізуюцца сумесныя эканамічныя праекты, вядзецца работа на міжнародных пляцоўках.

«Перакананы, што далейшае развіццё двухбаковага гандлю, падтрыманне цесных сувязяў у культуры, навуцы і адукацыі будуць і надалей служыць трывалай асновай для ўмацавання адносін паміж нашымі краінамі», — сказаў Прэзідэнт.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што ў нас ёсць нямала агульных поглядаў, якія могуць стаць апорай для пашырэння двухбаковага парадку дня з Чарнагорыяй. Дарэчы, беларускія турысты на працягу многіх гадоў адпачываюць на чарнагорскім узбярэжжы. Прэзідэнт выказаў надзею, што і народ Чарнагорыі па заслугах ацэніць выдатную прыроду Беларусі, яе культурную і гістарычную спадчыну.

Афрыканскі рэгіён набывае для нас усё больш важнае значэнне. Калійныя ўгнаенні і беларуская металургічная прадукцыя добра вядомыя ў сельскагаспадарчай і будаўнічай галінах Ганы. Кіраўнік дзяржавы бачыць далейшыя перспектывы для істотнага пашырэння супрацоўніцтва, перш за ўсё ў АПК і прамысловай кааперацыі. Яшчэ, на яго думку, неабходна актывізаваць кантакты на ўсіх узроўнях з Тунісам. Гэта дапаможа прапрацаваць новыя напрамкі ўзаемадзеяння і вывесці адносіны паміж нашымі краінамі на якасна новы ўзровень.

«З Канадай нас аб'ядноўвае не толькі любоў да хакея, але і шматгадовая дружба. Канадцы былі ў ліку тых, хто, не раздумваючы, працягнуў нам руку дапамогі ў цяжкія часы пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да пасла гэтай дзяржавы. — Ваша краіна стала першай на Захадзе, хто цалкам адмяніў гандлёвыя абмежаванні ў дачыненні да Беларусі. Гэта залог далейшага пазітыўнага развіцця ўзаемадзеяння і вельмі добры прыклад для некаторых іншых нашых партнёраў».

Беларусь разглядае Сальвадор як перспектыўнага партнёра ў Цэнтральнай Амерыцы. Мы зацікаўлены развіваць двухбаковы дыялог, узмацніць гандлёва-эканамічны складнік, пашыраць супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці, уключаючы хімічную галіну. Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь добра ведае гэтую краіну, але адносіны яшчэ вельмі слаба развіты. Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што пры ўдзеле пасла сітуацыя зменіцца ў лепшы бок, паколькі нашай краіне неабходная магутная база дзяржаў для супрацоўніцтва ў Амерыцы.

* * *

На заканчэнне Прэзідэнт шчыра пажадаў паслам поспехаў у выкананні адказнай дыпламатычнай місіі.

Ён выказаў надзею, што іх вопыт і прафесіяналізм стануць трывалай асновай для канструктыўнага ўзаемадзеяння нашых дзяржаў, а яго практычныя вынікі не прымусяць сябе доўга чакаць.

«Але, вядома, вырашаючы стратэгічныя задачы, не ўпусціце магчымасць даведацца больш пра Беларусь. Адкрыць для сябе яе прыгажосць і ўнікальнасць, у поўнай меры адчуць ветлівасць, гасціннасць нашага народа, пазнаёміцца з культурай, гісторыяй і, вядома ж, сучасным ладам жыцця нашых людзей», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ Каментарыі ў тэму

Раміз Башыч, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Чарнагорыі ў Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве:

— Беларусь для нас — сяброўская краіна. У нас добрыя перспектывы, мы будзем развіваць гэтыя адносіны. Нам варта больш супрацоўнічаць у эканоміцы. Зараз таварааварот сімвалічны, паколькі Чарнагорыя і геаграфічна далёка, і ў нас маленькая эканоміка. Але я спадзяюся, што будзе лепш. Турызм у нас сапраўды вельмі добры. Трэба больш супрацоўнічаць і ў міжнародных арганізацыях.

Ахмед Аль-Сааці, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Бахрэйн у Рэспубліцы Беларусь па сумяшчальніцтве:

— У першую чаргу я б хацеў павіншаваць нашы народы і дзяржавы з тым, што мы ўстанаўліваем дыпламатычныя ўзаемаадносіны, паколькі з'яўляюся першым паслом у Рэспубліцы Беларусь. Я б хацеў звярнуць увагу на сферу развіцця нашых эканамічных адносін, хацеў бы ўстанавіць прамыя кантакты паміж прыватным і дзяржаўным сектарамі.

Акрамя таго, планую развіваць нашы культурныя сувязі, паколькі ў вашай краіне вельмі багатая культурная спадчына. У вас выдатная музыка, выдатны тэатр. Дзяржава Бахрэйн, гісторыя якой налічвае ўжо без малога восем тысяч гадоў, таксама валодае выдатнай культурнай спадчынай. У 2019 годзе мы плануем правесці мноства абменаў і розных выставак, сустрэч.

Мы разглядаем Беларусь як вароты ў еўрапейскі рэгіён, тое ж самае можна сказаць пра Бахрэйн — гэта вароты для вашай краіны ў наш рэгіён.

Фам Хай, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам у Рэспубліцы Беларусь:

— На мой погляд, падпісанне Пагаднення аб зоне свабоднага гандлю (паміж ЕАЭС і В'етнамам. — **«Звязда»**) з'яўляецца станоўчым крокам, які значна паспрыяе паляпшэнню ўзаемаадносін паміж нашымі краінамі. Да сённяшняга дня, на жаль, нашы прадпрыемствы не маглі цалкам скарыстацца ўсімі магчымасцямі, якія адкрывае гэты дакумент. Таму я лічу, што трэба прыкласці далейшыя намаганні для таго, каб зрабіць якасны штуршок.

Ёсць вельмі вялікі патэнцыял для нарошчвання тавараабароту. У прыватнасці, мы зацікаўлены ў экспарце ў Беларусь сельскагаспадарчай прадукцыі. У сваю чаргу, мы зацікаўленыя ў тым, каб імпартаваць з вашай краіны рознае абсталяванне, прамысловыя тавары. Акрамя таго, наша насельніцтва зацікаўлена ў вашых мяса-малочных прадуктах.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Колькасць мільярдэраў за дзесяць гадоў падвоілася

Напярэдадні адкрыцця форуму ў Давосе фонд Oxfam выпусціў даклад «Грамадская карысць ці прыватнае багацце». У ім гаворыцца аб падваенні колькасці мільярдэраў за апошнія 10 гадоў і павелічэнні маёмаснай няроўнасці ў свеце.

За апошнія дзесяць гадоў колькасць мільярдэраў у свеце амаль падвоілася і дасягнула 2208 чалавек, а іх багацце штогод павялічваецца на $900 млрд, або амаль на $2,5 млрд у дзень. Такую інфармацыю напярэдадні адкрыцця Сусветнага эканамічнага форуму ў Давосе прадставіў фонд Oxfam International, які ставіць сваёй мэтай барацьбу з беднасцю. Даследаванне апублікавана на сайце фонду.

Аўтары даследавання сцвярджаюць, што яно заснавана на праверaных і актуальных звестках. У той час як багатыя багацеюць, гаворыцца ў дакладзе, 3,8 млрд чалавек, якія складаюць бедную частку чалавецтва, адчулі, што іх даходы зменшыліся на 11 %. Кожны з іх знаходзіцца на мяжы галечы і жыве менш чым на $5,5 у дзень.

Рэспубліка Палау адклікала прызнанне незалежнасці Косава

Рэспубліка Палау стала 13-й краінай, якая адклікала прызнанне незалежнасці самаабвешчанага Косава. Пра гэта паведаміла нацыянальнае тэлебачанне Сербіі РТС.

Каментуючы ў эфіры гэты поспех сербскай дыпламатыі, прэзідэнт Сербіі Аляксандар Вучыч заклікаў суграмадзян не ўпадаць у эйфарыю, бо сітуацыя ў Косаве і Метохіі працягвае заставацца вельмі цяжкай. «Мы робім нашу работу. Баюся эйфарыі і таго, што мы пачнём думаць, што вырашылі ўсе праблемы. Мы змагаемся і спрабуем дабіцца лепшай пазіцыі для Сербіі, чым раней, прашу грамадзян не думаць, што сітуацыя з Косава стала больш лёгкай», — заявіў ён.

Сербскі лідар нагадаў пазіцыю Бялграда пра гатоўнасць дамаўляцца з Прышцінай на аснове кампрамісу. Аднак кампраміс, падкрэсліў ён, прадугледжвае саступкі з абодвух бакоў, а не толькі з сербскага.

У ЗША лічаць, што Трамп сарваў выхад з бюджэтнага крызісу, адрэагаваўшы на крытыку па ТБ

Дэмакраты ў Кангрэсе ЗША не давяраюць прэзідэнту ЗША Дональду Трампу і лічаць, што ён з-за дробязі сарваў дасягненне дамоўленасці аб аднаўленні работы федэральнага ўрада. Гэтую пазіцыю выказаў у эфіры тэлеканала MSNBC кангрэсмен Джым Клайберн.

«Я лічу, што прэзідэнт зноў і зноў дэманструе няздольнасць выконваць умовы здзелкі. Успомніце, што мы накіравалі яму $1,6 млрд, якія можна было выдаткаваць на будаўніцтва сцяны [на мяжы з Мексікай], мы таксама пагадзіліся на папраўкі, якія задаволілі б нас усіх. І пасля некалькіх гадзін чакання таго, што дамоўленасць будзе заключана, ён кажа: не, адрэагаваўшы на крытыку вядучых пары ток-шоу», — абурыўся кангрэсмен-дэмакрат, відавочна, маючы на ўвазе першы ў новым годзе выпуск тэлеперадачы «Суботнім вечарам у прамым эфіры» з пародыяй на амерыканскага лідара ў выкананні акцёра Алека Болдуіна.

«Прэзідэнту варта засяродзіць увагу на амерыканскім народзе і забыцца пра тое, што гавораць пра яго нейкія тб-галовы. Іх не спыніш, што б ён ні рабіў», — дадаў Клайберн.

У НОВЫ ГОД — З ГАЛІНОВЫМІ НАДБАЎКАМІ

Заробкі некаторых катэгорый работнікаў у сферах адукацыі і аховы здароўя павялічаны з 1 студзеня. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 19 студзеня 2019 года № 36 «Аб павышэнні заработнай платы асобным катэгорыям работнікаў».

Згаданай пастановай прадугледжана ўстанаўленне галіновых надбавак педагагічным работнікам (уключаючы асоб з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу). На гэтыя мэты будзе накіроўвацца 5 % планавага фонду аплаты працы гэтых работнікаў. Памеры, парадак і ўмовы ўстанаўлення надбавак вызначаюцца Міністэрствам адукацыі па ўзгадненні з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Міністэрствам фінансаў. Таксама прадугледжана павелічэнне дзеючых памераў павышэння тарыфных акладаў памочнікаў выхавальнікаў (з 20 % да 25 %).

У сферы аховы здароўя павялічаны памер даплат урачам-спецыялістам (у тым ліку тым, якія з'яўляюцца кіраўнікамі) — з 20 да 24 % акладу; медыцынскім работнікам, якія маюць сярэднюю спецыяльную медыцынскую адукацыю, — з 13 да 16 % акладу; фармацэўтычным работнікам, якія маюць сярэднюю спецыяльную фармацэўтычную адукацыю, устаноўлена даплата ў памеры 1 % акладу (дадаткова да ўстаноўленага з 1 верасня 2018 года павышэння тарыфных акладаў на 40 працэнтаў).

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фестывалі

КАЛІ ХАТА ГАСЦЯМІ БАГАТА

У Іванаўскім раёне прайшоў XI міжрэгіянальны фестываль «Фальклор без межаў»

Гала-канцэрт фестывалю назвалі па-дамашняму — «На свята хата гасцямі багата». І заклалі ў гэтую назву асноўную ідэю аб тым, што фальклорная спадчына перадавалася менавіта на святы, калі ў доме збіраліся госці — сваякі, аднавяскоўцы, прыязджая радня. Так і пабудавалі чарговы «Фальклор без межаў», запрасіўшы на імпрэзу самадзейных артыстаў з Польшчы, Расіі, Украіны, ну і, вядома, землякоў. Было многа сустрэч, музыкі, танцаў, усмешак.

Сабралася каля трохсот чалавек. Напрыклад, фальклорны калектыў «Куранты» з польскага Бельска-Падляскага ўжо стаў улюбёнцам тутэйшай публікі, ён прыязджае ў Іванава не першы раз. Вельмі цёпла сустрэлі гледачы бранскі фальклорна-эстрадны калектыў «Дзебраначка», а таксама «Вербычаньку» з украінскага Любяшова.

Гэтым разам фэст вызначыўся вялікім удзелам моладзі, былі калектывы з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а таксама Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Па традыцыі на свята завіталі творчыя калектывы з розных абласцей Беларусі, ну і, вядома, іванаўцы паказалі найлепшае са свайго.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Усё, што вы хацелі спытаць пра жыллёвае заканадаўства

Якія падвохі могуць чакаць пры куплі кватэры ў растэрміноўку? Ці падлягае пададкаабкладанню падараная кватэра? Ці можна аспрэчыць дагавор дарэння? Як падзяліць асабовыя рахункі? Пры якіх умовах можна выселіць уласніка з кватэры?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой тэлефоннай лініі гасцям нашай рэдакцыі — **адвакатам спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі № 3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлане КАСЦЕВІЧ і Сняжане БАХОРЫНАЙ.**

Прамая лінія пройдзе **23 студзеня з 11 да 13 гадзін.** Наш тэлефон **8 (017) 287-18-71.**

Папярэднія пытанні можаце задаваць **сёння і заўтра з раніцы па тэлефоне 8 (017) 287-18-29** у працоўны час. Або можаце даслаць пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

Заробкі па новых правілах

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Асобныя выплаты будуць устанаўлівацца цэнтралізавана. Гэта:

— надбаўка за стаж работы ў бюджэтных арганізацыях (да 5 гадоў — 10 % ад базавай стаўкі, ад 5 да 10 гадоў — 15 %, ад 10 да 15 — 20 %, ад 15 і вышэй — 30 %). Парадак і ўмовы яе выплаты будзе вызначаць Мінпрацы і сацабароны;

— прэмія, на выплату якой будуць накіроўвацца сродкі, прадугледжаныя ў бюджэце, у памеры 5 % ад сумы акладаў работнікаў;

— аднаразовая выплата на аздараўленне, як правіла, пры выхадзе ў працоўны водпуск з разліку 0,5 акладу работніка (калі іншы памер не ўстаноўлены заканадаўчымі актамі ці ўрадам);

— матэрыяльная дапамога ў сувязі з непрадбачанымі матэрыяльнымі цяжкасцямі, на выплату якой будуць накіроўвацца сродкі ў памеры 0,3 сярэднямесячнай сумы акладаў работнікаў. Канкрэтныя памеры, парадак і ўмовы выплаты матдапамогі, а таксама прэмій, грошай на аздараўленне будуць зацвярджаць кіраўнікі бюджэтных арганізацый;

— надбаўкі і даплаты, прадугледжаныя заканадаўчымі актамі і пастановамі Саўміна (напрыклад, надбаўка за работу на ўмовах кантрактнай формы найму, даплаты за навуковую ступень і званне, за работу звышурочна, у святы, выхадныя, за работу са шкоднымі (небяспечнымі) умовамі працы). Надбаўка за работу на ўмовах кантрактнай формы найму будзе ўстанаўлівацца ў адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта ад 26 ліпеня 1999 года № 29, а іншыя выплаты — указамі кіраўніка краіны, пастановамі Саўміна і Мінпрацы і сацабароны.

Таксама пашырацца правы кіраўнікоў дзяржаўных органаў і бюджэтных арганізацый па вызначэнні надбавак і даплат работнікам.

— Яны будуць устанаўлівацца дадаткова да цэнтралізаваных выплат з улікам галіновай спецыфікі і вынікаў працы ў межах сродкаў, выдаткаваных з бюджэту на аплату працы работнікаў, а таксама сродкаў, атрыманых ад ажыццяўлення дзейнасці, што прыносіць даходы, і з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, — адзначаюць у ведамстве.

Пры ўвядзенні новай сістэмы аплаты працы не дапускаецца зніжэнне заробкаў (без прэміі).

Указ істотна скароціць колькасць нарматыўных прававых актаў, што рэгулююць аплату працы ў бюджэтнай сферы.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Запрашальнік

ЛЯДОВАЯ СІМФОНІЯ Ў БАТАНІЧНЫМ САДЗЕ

Цэнтральны батанічны сад Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі запрашае 23—26 студзеня наведаць пяты фестываль-конкурс лядовых і снежных скульптур «Свет крышталяў у батанічным садзе».

Наведвальнікі змогуць убачыць і ацаніць майстэрства найлепшых скульптараў, стануць сведкамі таго, як крышталі лёду ператвараюцца ў творы снежна-лядовага мастацтва, якое патрабуе ад майстроў вялікага цярпення, мужнасці і гатоўнасці працаваць пры любым надвор'і.

У мерапрыемстве прымуць удзел дзевяць камандаў прафесійных скульптараў і столькі ж студэнцкіх камандаў профільных факультэтаў дзяржаўных устаноў адукацыі. Урачыстае адкрыццё пятага фестывалю-конкурсу адбудзецца 26 студзеня ў 14.30. У гэты дзень ледзяныя скульптуры прадставяць публіцы, таксама будуць падведзеныя вынікі творчых спаборніцтваў. Наведвальнікі таксама змогуць прагаласаваць за ўпадабаную скульптуру ў намінацыі «Прыз глядацкіх сімпатый».

Гасцей свята чакае гала-канцэрт з удзелам гурта «Без білета», забаўляльная віктарына, конкурсы з розыгрышам прызоў і музычнае піратэхнічнае шоу. На тэрыторыі саду працуюць гандлёвыя кропкі, зімовыя атракцыёны. Бонус для наведвальнікаў — пачастунак гарачай гарбатай ад батанічнага саду — на свежым паветры гэта будзе асаблівым задавальненнем.

На перыяд правядзення фестывалю рэжым працы батанічнага саду падоўжаць: у выхадныя дні касы цэнтральнага ўвахода будуць працаваць да 18.30, экспазіцыйная аранжарэя — да 19.00, па буднях — да 18.00 і 18.30 адпаведна.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАДСТРЭЛІЎ ЗУБРА

У Дзятлаўскім раёне следчыя распачалі крымінальную справу па факце незаконнага палявання на зубра.

Па інфармацыі **афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці Сяргея ШАРШАНЕВІЧА,** паляўнічы, 48-гадовы жыхар Мінска, здабыў чырванакніжную жывёлу на сельскагаспадарчым полі непадалёк ад вёскі Чырвоны Бор прыкладна а пятай гадзіне раніцы. Мужчына — кіраўнік прыватнай фірмы, яго паляўнічы стаж складае амаль 30 гадоў. Для палявання ў Дзятлаўскім раёне выкарыстаў зарэгістраваную зброю. Першапачаткова планаваў здабыць аленя і афарміў для гэтага дазвольныя дакументы.

Апроч жывёлы канфіскаваныя паляўнічы карабін Tikka M595 з прыцэлам начнога бачання, некалькі стрэляных гільзаў і патрон. Туша зубра накіравана на ветэрынарную экспертызу. Акрамя таго, плануецца прызначыць судова-балістычную экспертызу наконт канфіскаваных карабіна, патрона і гільзаў. Дзятлаўскі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу па факце незаконнага палявання, якое прывяло да прычынення шкоды ў асабліва буйным памеры. Дакладны яе памер устанаўліваецца. Следчыя прымуць прадугледжаныя законам меры для кампенсацыі шкоды. Канчатковая прававая ацэнка таму, што адбылося, будзе зроблена пасля завяршэння расследавання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Надвор'е

МАРОЗ І СОНЦА

У чацвер і пятніцу ўначы ажно да мінус 21 градуса

На працягу ўсяго працоўнага тыдня ўплыў на надвор'е будзе аказваць вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравалася ў халоднай паветранай масе. Таму будзе марозна і пераважна без ападкаў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Аднак у аўторак малаактыўны франтальны раздзел прынясе ў многія раёны невялікі снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Максімальная тэмпература паветра ў асноўным складзе 2—7 марозу, а па поўначы краіны будзе халадней: там ад мінус 8 да мінус 13 градусаў.

І ў сераду чакаецца без істотных ападкаў, толькі раніцай і днём месцамі па поўдні краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 6 да мінус 13 градусаў, пры праясненнях тэмпература панізіцца да 14—18 марозу. Днём чакаецца ад мінус 3 да мінус 10 градусаў ніжэй за нуль. З чацвярга ў нашу краіну прыйдзе час сапраўднага арктычнага холаду. У гэтыя дні будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па Гомельскай вобласці пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература ўначы складзе 8—15 градусаў ніжэй нуля, пры праясненнях паветра астудзіцца ад мінус 16 да мінус 21 градуса. Удзень будзе не больш чым ад мінус 4 да мінус 10 градусаў, а месцамі і 11—12 марозу.

Будзе пераважна без ападкаў і ў пятніцу, толькі па паўднёвым захадзе краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы чакаецца ад мінус 10 да мінус 17 градусаў, пры праясненнях 18—21 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах — 7—9 градусаў ніжэй за нуль. Нават днём будзе рыпець пад нагамі — чакаецца 5—12 марозу.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні ўмовы надвор'я будуць вызначаць атмасферныя франты, якія абумовяць часам добры снег і прыкметнае паслабленне марозу.

Сяргей КУРКАЧ.

БОЛЬШ, ЧЫМ ДАПАМОГА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыялісты Цэнтра таксама афармляюць дакументы для прыёму жыхароў у дамы-інтэрнаты, такіх у раёне два: Рэсцянскі агульнага тыпу і псіханеўралагічны ў вёсцы Расінка. Выдаюць бясплатна (інвалідам I групы) і напракат тэхнічныя сродкі сацыяльнай рэабілітацыі (хадункі, вазкі, адмысловыя бытавыя прыстасаванні), а таксама афармляюць паперы на атрыманне дзіцячага харчавання для дзяцей да двух гадоў тым, у каго даход не перавышае бюджэту пражыткавага мінімуму, і грошай на набыццё падгузнікаў для дарослых інвалідаў I групы і дзяцей з чацвёртай ступенню страты здароўя.

Навучальныя ўстановы накіроўваюць у Цэнтр сацыяльнай абароны лісты, у якіх інфармуюць пра размеркаванне або вяртанне ў раён маладых людзей, якія маюць статус дзяцей-сірот. З апошнімі дзяржаўная ўстанова заключае дагаворы і аказвае ім кансультацыйную і псіхалагічную дапамогу, спрыяе сацыяльнай адаптацыі і абараняе іх правы і гарантыі.

— Глядзім, каб не парушалася іх права на атрыманне жылля, ці ёсць праблемы з працаўладкаваннем. Зараз у нас 17 маладых чалавек на ўліку. У раёне іх, канешне, больш, бо яны маюць права адмовіцца ад сацыяльнага патранату, і многія жадаюць жыць самастойна альбо з'язджаюць у Расію, і таму скасоўваюць дагавор. Але яны ведаюць, куды звярнуцца, калі ўзнікне патрэба ў дапамозе, — растлумачыла **загадчыца аддзяленнем сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі Іна ІСАЕНКА.**

Шанц на вяртанне

У 2018 годзе Чавускі раённы Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва дапамагаў у аднаўленні дакументаў, прафарыентацыі і працаўладкаванні сямі чалавекам без пэўнага месца жыхарства. Як правіла, гэта мужчыны перадпенсійнага або пенсійнага ўзросту, якія злоўжываюць алкаголем. Такія людзі прыходзяць самі альбо пра іх паведамляе міліцыя. Рашэннем райвыканкама ў інтэрнаце адкрыты пакой для часовага пражывання такіх людзей. Супрацоўнікі Цэнтра сабралі туды посуд, прадукты, сродкі гігіены.

Шахматна-шашачны клуб для пенсіянераў.

«Большасць з насельнікаў пакоя зноў вяртаецца да звыклага ладу жыцця, але для некаторых гэта — шанц, — кажа Іна Ісаенка. — Зараз там пражывае два чалавекі, і мы спадзяёмся, што аднаму з іх хутка будзе выдзелены пакой у інтэрнаце».

З людзьмі, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, Цэнтр працуе ў адпаведнасці з адмысловай інструкцыяй. Ім аказваецца псіхалагічная і самая розная сацыяльная дапамога. Такіх зараз сем чалавек.

Усяго на працягу мінулага года толькі тых, хто звярнуўся сюды першы раз, зарэгістравана восем тысяч. З іх многія прыходзілі потым і тры, і шэсць разоў. Колькасць зваротаў штогод расце. Не толькі таму, што павялічваецца колькасць сацыяльна ўразлівых грамадзян, але і таму, што Цэнтр прапануе новыя паслугі. Напрыклад, летась тут адкрылася сацыяльная цырульня — ініцыятыва, рэалізаваная ў рамках праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуе Еўрапейскі саюз і рэалізуе Праграма развіцця ААН. Пасля перапынку аднавіла сваю работу швейная майстэрня, якая па нізкіх расцэнках абслугоўвае пенсіянераў і іншых, хто мае патрэбу ў сацыяльнай абароне.

— Можа яшчэ што-небудзь адкрыем, — весела заўважыла Наталля Манышава.

— Ёсць задумкі? — пытаюся.

— Пакуль... адпачываем, — усміхаецца спецыяліст. — Мы толькі завяршылі складаны праект «Сацыяльная цырульня». Было вельмі цяжка, бо мы ўсё рабілі ўпершыню, многае не ведалі. Была велізарная справаздачнасць. Самі набывалі абсталяванне, пры гэтым трэба было захаваць шмат няпростых умоў. Праводзілі майстар-класы. Усё гэта прывяло да добрага выніку, але мы не мелі ніводнага спакойнага дня.

Рэпетыцыя творчага калектыва «Суседзі».

Супраць адзіноты

Самы, напэўна, вялікі блок работы Цэнтра — абслугоўванне пажылых людзей і інвалідаў дома. 465 такіх жыхароў раёна рэгулярна наведваюць 65 сацыяльных работнікаў. У залежнасці ад умоў пражывання падапечных і ступені іх самастойнасці ім аказваюць самыя розныя паслугі робяць пакупкі, арганізоўваюць гарачае харчаванне, прыносяць ваду і дровы, распальваюць печ, чысцяць снег, прыбіраюцца, уносяць плату за камунальныя паслугі, аказваюць першую медыцынскую дапамогу, дапамагаюць з афармленнем дакументаў і робяць яшчэ шмат чаго. Акрамя таго, у штаце Цэнтра ёсць сядзелка, якая штодня з раніцы да вечара даглядае ляжачую жанчыну.

Асноўную долю пазабюджэтных сродкаў у Цэнтр прыносяць менавіта сацыяльныя работнікі — іх паслугі платныя. 40 % ад атрыманага даходу ўстанова мае права накіроўваць на заробкі сваіх супрацоўнікаў, гэта, напэўна, дазваляе трымаць дастатковы для ўсёй вялізнай работы штат. Усяго ў Чавускім раённым цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва працуе 86 чалавек, з іх 18 — у самім Цэнтры.

У дзень, калі журналісты «Звязды» наведвалі гэтую ўстанову, там было шумна і шматлюдна: рыхтаваліся да канцэрта ўдзельнікі клуба самадзейнай творчасці «Суседзі», працавалі цырульня і швейнае атэлье, ішла інтэлектуальная барацьба ў шахматна-шашачным клубе «Белае і чорнае», па дапамогу прыходзілі людзі. Аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту прымае столькі людзей, колькі пажадае прыйсці. І калі адначасова ў адно памяшканне ўсе ахвотныя не змяшчаюцца, то бавяць час тут пазменна.

— Гэта маладыя пенсіянеры, актыўныя, — патлумачыла Наталля Манышава.

— Тут пяе мая маці, якая ўсё жыццё прапрацавала галоўным бухгалтарам у банку. Яна не ведала, што можа пець. Пасля выхаду на пенсію дома ёй было сумна. Калі адкрылася гэта аддзяленне, яна пачула пра клуб «Суседзі», прыйшла, і цяпер для яе гэта такая аддушына! — дадала Іна Ісаенка. — Яны ладзяць канцэрты, ездзяць па дамах-інтэрнатах, дораць радасць іншым і самі атрымліваюць задавальненне. Кожны вечар маці мне расказвае пра новы рэпертуар і свае ўражанні.

Падушка бяспекі ў сямейнай катастрофе

Больш за шэсць гадоў таму ў Цэнтры адбылося афіцыйнае адкрыццё крызіснага пакоя. З таго часу ім скарысталіся 16 жанчын і 20 дзяцей. Іх жыццёвыя сітуацыі былі розныя. Пазалетась тут пражывала жанчына з трыма дзецьмі, якая засталася без жылля і падтрымкі блізкіх, да таго ж яна не магла ніяк аформіць дапамогу на малодшае дзіця. Яна пражыла ў крызісным пакоі 36 дзён разам з малымі. Значную суму на пакупку прадуктаў для гэтай сям'і тады даў Дэйвід Шо, каардынатар праекта «Канадская дапамога ахвярам Чарнобыля», які якраз знаходзіўся ў Чавусах. Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання пасадзейнічаў, каб жанчыну засялілі ў жылы блок заводскага інтэрната, супрацоўнікі Цэнтра дапамаглі зрабіць там рамонт. Цяпер жыццё гэтай жанчыны наладзілася, яна пераехала ў іншы горад, але калі бывае ў Чавусах, заўсёды заходзіць сюды і расказвае пра сябе.

З пацярпелымі ад дамашняга гвалту тут праводзіцца асобная работа. Па-першае, можна пазваніць па тэлефоне даверу і атрымаць псіхалагічную і юрыдычную кансультацыю. Па-другое, супрацоўнікі раённага ўпраўлення ўнутраных спраў, калі сутыкаюцца з ахвярай дамашняга гвалту, паведамляюць ёй пра магчымасць знайсці часовы прытулак у райцэнтры і складаюць інфармаваную згоду на перадачу звестак пра складаную сямейную сітуацыю Цэнтру сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Тады з ахвярай гвалту працуе псіхолаг. За 2018 год было складзена 67 інфармаваных згод. У папярэдні год — 131.

— Нам прыйшлося навучаць участковых інспектараў адрозніваць сямейны скандал ад дамашняга гвалту, бо гэта розныя рэчы, — заўважыла Іна Ісаенка. — Але выправіць сітуацыю вельмі складана, бо часта гвалт для жанчыны становіцца нормай, а крызісны пакой з'яўляецца толькі кароткай перадышкай. Да таго ж, сюды ні разу не прыязджалі жанчыны з раёна: ад мужа схаваешся, але ж працаваць трэба, а адсюль на вясковую ферму, скажам, не наездзішся.

Цырульня на колах

У рамках праекта «Сацыяльная цырульня» Чавускі раённы цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва набыў аўтамабіль — для аказання паслуг пансіянерам, інвалідам і малазабяспечаным грамадзянам у аддаленых вёсках, а таксама дома. Еўрапейскім саюзам на гэты праект было вылучана больш за 12 тысяч еўра, суфінансаванне склала каля 1,5 тысячы еўра. На гэтыя сродкі, акрамя пакупкі аўтамабіля, было адрамантавана і абсталявана памяшканне, набытыя мэбля, інструменты, расходныя матэрыялы, праведзены майстар-класы для людзей сталага ўзросту.

Пасля наведвання Цэнтра мы разам з **майстрам Эльмірай ЖЫРКЕВІЧ** адправіліся за 30 кіламетраў ад Чавус у аграгарадок з вельмі прыгожай назвай — Сласцёны. Там мабільную цырульню чакалі пяць жанчын. Гэта быў запланавы выезд, звычайна людзей прыходзіць удвая больш.

— На раён выязджаем адзін альбо два разы на тыдзень — гледзячы па колькасці заявак, якія складаюць сацыяльныя работнікі, — расказала па дарозе Эльміра Жыркевіч. — Людзі вельмі ўдзячныя. І мне самой вельмі падабаецца рабіць людзей прыгажэйшымі, бачыць, як у іх падымаецца настрой.

Мабільная цырульня на выездзе ў аграгарадку Сласцёны.

Швейная майстэрня ў Чавускім РЦСАН.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ,
Чавускі раён.
(Больш фота на сайце zviazda.by).

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 1 (109) Вторник, 22 января 2019 года

Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года

КУДА ЕХАТЬ ЗА ВПЕЧАТЛЕНИЯМИ?

Рассказывают представители туриндустрии

Фото Андрея САЗОНОВА.

Первым важным спортивным событием года стал чемпионат Европы по фигурному катанию, который принимает «Минск-Арена» на этой неделе. В столицу приехали спортсмены почти из 30 стран и их болельщики. Беларусь в танцах на льду представят Анна КУБЛИКОВА и Юрий ГУЛИЦКИЙ.

Ко II Европейским играм готовятся не только спортсмены, но и туркомпании. Напомним, что в прошлом году перед ЧМ по футболу, который проходил в России, Беларусь и Россия подписали соглашение о безвизе на оба спортивных мероприятия. Несмотря на то, что подписание «большого» документа о взаимном признании виз пока не состоялось, зрители смогут спокойно проехаться по нашей стране, а также посмотреть российские города.

ИТОГИ ГОДА

Председатель правления Республиканского союза туристической индустрии Филипп ГУЛЫЙ отмечает, что в 2018-м, как никогда ранее, белорусы пришли с коллегами из России к конкретике по продвижению комбинированных туров и продуктов на иностранные рынки. При этом растет поток прилетающих из крупных российских городов-миллионников, где есть прямое авиасообщение. Статистику озвучил **заместитель директора Департамента по туризму Министерства спорта и туризма Беларуси Виталий ГРИЦЕВИЧ.** За январь — ноябрь экспорт туруслуг Беларуси составил около 205 млн долларов. Доля экспорта в Россию — 57 %. Есть рост на 11 %, при этом статистика охватывает только туристов, которые подписали соответствующие договоры.

Однако прошлый год был не таким простым. Банкротство некоторых российских туроператоров, работавших на территории Беларуси, вскрыло проблемы сотрудничества. Например, компания «Натали Турс». Белорусские турфирмы, которые выплатили компенсацию людям, подали документы в российскую страховую, но вернуть свои деньги из-за нюансов в законах они не смогли. Соответственно, как говорит представитель министерства, это станет одной из задач на этот год: на площадке ЕАЭС решить вопрос о равных правах. К слову, в рамках Договора о ЕАЭС к 1 декабря должен быть сформирован единый рынок туруслуг между Беларусью, Казахстаном и Россией. А эта ситуация показывает, что к единому рынку страны пока не готовы.

О том, что индустрия заинтересована в синхронизации законодательства, говорили еще три года назад, напоминает **директор российской ассоциации «Объединение туроператоров в сфере выездного туризма «Турпомощь» Александр ОСАУЛЕНКО**. По его мнению, это нужно для того, чтобы туроператоры обеих стран могли совместно защищать своих туристов при выезде в третьи страны. Это поможет и в создании единого продукта. На сегодня туризм из России в Беларусь считается внешним даже для близлежащих регионов. Чтобы российской компании отправить туриста в Беларусь, она должна быть членом «Турпомощи» и иметь фингарантии, это ставит агентства в невыгодное положение. Плюс, на что обращает внимание Филипп Гулый, сфера туризма в обеих странах попадает в межведомственное пространство. Ресурсов Минспорта Беларуси для регулирования отрасли, по его мнению, недостаточно. Например, для того чтобы российский туроператор мог приобретать белорусский продукт, ему необходимо предоставить справку о резидентстве. Несмотря на то, что он по факту и так российское юрлицо. Эту проблему, по словам Филиппа Гулого, с МНС не могут решить уже пару лет.

(Окончание на 2-й стр. «СЕ».)

НОВОСТИ СОЮЗА

Электронная биржа труда и не только

В Москве прошло заседание Совета ЕЭК

В конце прошлой недели заместители глав правительств стран Евразийского экономического союза и председатель Коллегии ЕЭК Тигран Саркисян обсудили разработку цифровой экосистемы для обеспечения занятости граждан, порядок реализации цифровых проектов и ряд других вопросов на заседании Совета ЕЭК. Белорусскую делегацию возглавлял вице-премьер Игорь Петришенко. Участие в работе коллегии принял также посол Беларуси в России Владимир Семашко.

Инициативу по созданию Евразийской электронной биржи труда выдвинуло Министерство труда и социальной защиты населения Казахстана. «Электронная биржа труда позволит с одной стороны работодателю, с другой — тем физическим лицам, которые ищут работу, находить на этой площадке рабочие места, а также заключать договоры», — считает Тигран Саркисян. Он отметил, что этот достаточно перспективный проект получил одобрение членов Совета ЕЭК. «Мы договорились о том, что запускаем НИР (научно-исследовательскую работу. — **Прим. «СЕ»**) по реализации технической документации для этого проекта», — резюмировал председатель Коллегии ЕЭК.

Как сообщается на сайте Евразийской экономической комиссии, Совет ЕЭК сформировал 15-ю Евразийскую технологическую платформу (ЕТП) — «Энергетика и электрификация». Учредителями стали девять предприятий и научных институтов Беларуси, Казахстана, Кыргызстана и России. Основными направлениями деятельности новой ЕТП будут энергетическое машиностроение, электрификация, а также создание и распространение «умных» электрических сетей — электроустановок, обеспечивающих параллельную работу в сети различных источников энергии. Планируется развивать и использовать возобновляемые источники для энергоснабжения удаленных потребителей.

К слову, уже есть 14 евразийских технологических платформ в сфере космических технологий, биологии, медицины, фотоники, экологии, пищевой и перерабатывающей промышленности, сельского хозяйства. Комиссия планирует продолжить работу по формированию приоритетных евразийских платформ.

Кроме этого, во время заседания был также рассмотрен опыт компании Societas Europaea, правовые вопросы формирования наднациональных предприятий, а также преимущества, которые создает такое правовое поле для продвижения производителей. «Мы изучили опыт Европейского союза по созданию комфортных условий для тех предприятий, которые работают на территории нескольких стран, чтобы сформировать правовое поле для евразийских брендов», — подчеркнул Тигран Саркисян.

По инициативе российской стороны Совет ЕЭК рассмотрел предложения, направленные на углубление интеграционного сотрудничества, развитие предпринимательской инициативы и обеспечение выгод для граждан и бизнеса от интеграции. В частности, речь идет о таких проектах, как развитие системы денежных переводов между гражданами и организациями в рамках союза, а также совершенствование логистических и оптово-распределительных механизмов во внутренней торговле сельскохозяйственными товарами и продуктами питания.

Как сообщил председатель Коллегии ЕЭК Тигран Саркисян, выступая на пресс-брифинге перед журналистами, «Совет дал поручение Комиссии разработать механизмы, которые позволили бы реализовать интеграционные проекты в рамках ЕАЭС, предложить критерии оценки эффективности этих проектов». Достигнута договоренность, что другие страны союза к следующему Совету ЕЭК предложат свои интеграционные проекты.

Надежда АНИСОВИЧ.

КУДА ЕХАТЬ ЗА ВПЕЧАТЛЕНИЯМИ?

(Окончание. Начало на 1-й стр. «СЕ».)

Комментируя ситуацию с «Натали Турс», Александр Осауленко отмечает, что в тот раз «Турпомощь» вместе с Ростуризмом помогла белорусам вернуться на родину. Однако эвакуационные мероприятия и компенсации платятся из фондов. А эти туристы оказались неучтенными: за них деньги не перечислялись. Синхронизировать в подобном случае законодательство будет сложно. Как говорит Филипп Гулый, возможность работать по «внутренним» правилам решила бы часть проблем. У нас анонсировано свободное движение услуг и капитала, но по факту это не работает. Например, перечисляемые платежи стоят на валютном контроле.

НЕСВОБОДНОЕ ДВИЖЕНИЕ

Фактически то, что происходит сегодня на границе, не устраивает никого, отметили эксперты с обеих сторон. «То, что граждане России и Беларуси спокойно, за исключением небольшой пробки, ожидания, могут передвигаться — это замечательно, но в наших экскурсионных автобусах, железнодорожных поездах не могут передвигаться граждане Казахстана, Кыргызстана, Армении, даже проживающие, работающие у нас в стране, — подчеркнул Филипп Гулый. — То есть они в Беларусь въехать могут, а выехать фактически никак. Мы все теряем туристов, прибыль и привлекательность. Огромная проблема и сложность с туристами из третьих стран».

Как отмечают представители туризма, их в принципе устроит любое решение: либо полное отсутствие погранконтроля (то есть подписание и реализация соглашения о взаимном признании виз), либо настоящий пропускной пункт с паспортом и шлагбаумом. Тогда эти вопросы решаются.

Если заработает безвиз, он снимет проблемы, но белорусскому турбизнесу будет работать намного сложнее, чем раньше. Как считает Филипп Гулый, российские компании получат здесь определенный карт-бланш. С другой стороны, произойдет некоторая естественная зачистка рынка: в Беларуси останутся только те въездные компании, которые представляют интересный продукт.

Виталий Грицевич принимал участие в разработке соглашения о взаимном признании виз и считает, что оно отработано с двух сторон, поэтому может быть подписано во время одной из ближайших встреч. Он напомнил, что по нашему безвизу, полученному при въезде в Беларусь через Национальный аэропорт, въезжать в Россию нельзя. То же самое касалось FAN ID, который давал право приезжать без визы

В этом году «Белавиа» планирует взять на борт около 3,6 млн пассажиров.

в Россию, однако на Беларусь такое разрешение не распространялось. Но многие приезжали в Беларусь, а уезжали из страны-соседки или наоборот, тем самым нарушая законодательство. В следующий раз при въезде в Союзное государство они рискуют получить отказ, так как, может, сами того не зная, нарушили закон. Такое положение дел отражается на туристическом имидже Беларуси и России и ведет к репутационным потерям, а соглашение сыграло бы нам на руку, сняв этот вопрос.

Филипп Гулый обращает внимание, что из-за ситуации, либо безвиз, либо пункт пропуска.

ЛЕТИМ ДАЛЬШЕ?

25	Автомонтажный корпус	640/С-39783	8785,1
26	Дренажная насосная станция (инв. № 98329)	640/С-84375	330,6
27	Сети канализации (инв. № 98626)	640/С-84379	–
28	**Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)**		

Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **8,4478 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101. Земельный участок имеет ограничения в использовании: зона санитарной охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения на площади 8,4478 га. Имущество сдается в аренду (сведения об арендаторах можно получить у продавца и организатора аукциона).

Начальная цена с НДС (20 %) **– 5 850 000,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **585 000,00 бел. руб.**). Стоимость снижена на **25 %.**

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Шаг аукциона – 5 процентов.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ о внесении суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: юр. лицом РБ – копии устава со штампом о проведении гос. регистрации, свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивидуальным предпринимателем РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в торгах физ. лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физ. лица, индивидуального предпринимателя, юр. лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов соглашение.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

В день проведения торгов победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) подписывает протокол о результатах торгов.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.12.2018.

Аукцион состоится **07.02.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.02.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Общим собранием акционеров принято решение от 17.01.2019 о реорганизации Закрытого акционерного общества «РентЭнергоМаш» (местонахождение: г. Минск, ул. Инженерная, д. 22, пом. 210) в форме выделения (Депозитарий: Общество с ограниченной ответственностью «КАСКАД-93-ИНВЕСТ», 220007, г. Минск, ул. Володько, 6, к. 18, УНП 100992061).

Страховые полисы: карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 16345221, 16788936; полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА № 1438844; квитанция о приеме наличных денежных средств серии СВ № 4477501-4477502 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 100357923

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16

Предмет аукциона

Лот № 1.
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16-16/2, 16/8-16/18, 16/23

Производственная база (одним лотом) в следующем составе: **производ. корпус** (500/С-49698) 1130,5 кв. м, **диспетчерская** (500/С-53818) 54,7 кв. м, **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (500/С-47329) 7664,8 кв. м, **производ. корпус** (500/С-53224) 4340,5 кв. м, **компрессорная** (500/С-54017) 473,6 кв. м, **электропечь термич.** (500/С-54018) 39,8 кв. м, **здание весовой** (500/С-54019) 24,3 кв. м, **административно-хозяйст. корпус** (500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпорные стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница) 2323,4 кв. м, **склад** (500/С-53297) 2328,4 кв. м, **склады** (500/С-53808) 895,5 кв. м, **склады, гаражи** (500/С-53897) 453,6 кв. м, **склады, администрат. помещения, агрегатные** (500/С-53846) 563,7 кв. м, **инженер. корпус** (500/С-46093) 3348,6 кв. м, **административно-производ. корпус № 4** (500/С-53638) 19710,5 кв. м, **склад** (500/D-708019487) 2193,5 кв. м, **строит. цех** (500/С-53845) 507,9 кв. м, **насос. станция автоматич. пожаротушения** (500/С-54016) 194,4 кв. м, **станция очистки сточных вод** (500/С-54015) 305,1 кв. м, **градирня** (500/С-55130) 39,1 кв. м, **объекты растительности** (деревья 10 шт., газоны)

Сведения о земельном участке**:* предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га** (срок действия по 31.12.2019). ***Ограничения (обременения): расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах электрич. сетей, зонах сетей и сооружений водоснабжения, канализации, теплоснабжения, объектов газораспределит. системы, недвижимых материальных историко-культурных ценностей.

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 20 589 210,43 бел. руб.
(снижена на 20%)

Лот № 2.
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16/5

Производственный корпус № 2 (500/С-53630, составные части: проезды, площадки, подкран. пути, дорожки, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота) 9 755,90 кв. м, **объекты растительности** (деревья 14 шт., газоны)

Сведения о земельном участке**:* предоставлен продавцу для производства машин и оборудования (машиностроения) на праве временного пользования пл. **1,9448 га** (срок действия по 31.12.2019). ***Ограничения (обременения): расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах электрических сетей, зонах сетей и сооружений водоснабжения, канализации, теплоснабжения, объектов газораспределит. системы

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 267 568,59 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Лот № 3
Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16/6, 16/28

Здание специализированное иного назначения (производ. корпус) (500/С-48879, составные части: проезды, площадки, подкран. пути, подпорные стены, бордюр 0,16, ограждения, ворота, калитка) 2407,9 кв. м, **газораспределит. пункт** (500/С-53782) 12,7 кв. м, **объекты растительности** (деревья 3 шт., газоны)

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу участок для размещения объектов иного назначения на праве аренды, доля 249/1000 от пл. **1,7466 га** (срок действия по 31.03.2026). ***Ограничения (обременения)***: расположен в водоохранной зоне; в охранных зонах линий связи и радиофикации, в охранных зонах электрических сетей, объектов газораспределит. системы, недвиж. материальных историко-культурных ценностей

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 752 820,37 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Обременения: площади зданий частично сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона.

В соответствии с градостроительным проектом детального планирования, на земельных участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекательного, выставочно-музейного, музейно-просветительского назначения, многоуровневой автостоянки, в связи с чем аукцион проводится с условием реализации покупателями инвестиционных проектов, предусмотренных детальным планом.

На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое будет передано покупателю в установленном законодательством РБ порядке с сохранением целевого назначения

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**20** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от **03.01.2019**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 07.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 05.02.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»
извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 15 марта 2019 г. очередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах работы Общества в 2018 году и основных направлениях развития на 2019 год.
2. Отчет Совета директоров и ревизионной комиссии о работе в 2018 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2018 год. О дивидендах за 2018 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2019 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
6. Выборы членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
7. Утверждение списка аффилированных лиц Общества.

Место проведения собрания по месту нахождения ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ»: г. Минск, ул. Аранская, 13, каб. 15.

Начало работы собрания – в 12.00.

Регистрация участников собрания – с 11.00 до 11.50 в день проведения собрания. Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 1 марта 2019 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 07.02.2019, по месту нахождения Общества.

Совет директоров ОАО «ПРОМЭЛЕКТРОМОНТАЖ».

УНП 100088916

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ
Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса, 13А

Режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв с 13.00 до 14.00, тел.: 327-52-36, 226-03-01.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей декларации, с указанием фактических сроков строительства:

– ул. Щорса, д. 1 – 41 мес., ул. Налибокская, д. 34 – 20 мес., ул. Одинцова, д. 54 – 13 мес., ул. Г. Ширмы, д. 7 – 18 мес., пр-т Газеты «Правда», д. 1 – 15 мес., ул. Одинцова, д. 56 – 13 мес., ул. Горецкого, д. 36 – 13 мес., ул. Академика Высоцкого, д. 3 – 9,8 мес., ул. Героев 120-й Дивизии, 2 – 23,9 мес., ул. Пономарева, 9А – 22 мес.

Объединение осуществляет строительство объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 32 по генплану.

Свидетельство (удостоверение) № 500/938-5799 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 24 октября 2016 года.

Земельный участок площадью 0,1645 га.

Проектом предусмотрено строительство односекционного 19-этажного 132-квартирного жилого дома в конструкциях серии М111-90 с техническим подпольем и теплым чердаком.

Начало строительства жилого дома – 26 июля 2017 года.

Срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 5 февраля 2019 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу (заключение от 04.08.2015 № 374-15/15, дополнения к заключению от 12.01.2017 № 675-15/16; от 08.11.2018 № 699-15/18).

Договор строительного подряда от 04.07.2017 № 205с-07-17, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить, на строительство квартир:

двухкомнатные №№ 74, 81, 95, 102, 109, 126, 128;

трехкомнатные №№ 76, 125, 132.

Предметом договора будет являться строительство жилого помещения.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

2 500 руб. – для 2-комнатных и 3-комнатных квартир при условии оплаты согласно графику платежей.

Первоначальный взнос при условии оплаты согласно графику платежей составляет 50 % от стоимости квартиры, оплата должна быть произведена дольщиком в течение 5 (пяти) банковских дней со дня регистрации в Мингорисполкоме договора создания объекта долевого строительства.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений.

Заявления о долевом строительстве жилых помещений будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящей декларации в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А, непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Опубликованную декларацию от 18.05.2018 г. № 93 (28709) в части квартир №№ 74, 76, 81, 95, 102, 109, 125, 126, 128, 132 считать недействительной.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА УНИТАРНОГО ПРЕДПРИЯТИЯ «САКВОЯЖ»

Предметы торгов

Лот № 1:

1) Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-26758 площадью 470,2 кв. м (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: Склад № 9), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000022000474, площадью 0,8146 га, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Индустриальная, д. 5У/1.

Составные части и принадлежности: железобетонный забор площадью 464 кв. м, металлические ворота, водопроводная сеть протяженностью 157,6 м, канализационная сеть протяженностью 129,8 м, 3 железобетонные опоры, асфальтобетонное покрытие площадью 642 кв. м, асфальтобетонная площадка площадью 38 кв. м;

2) Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-26762 площадью 475,0 кв. м (назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад № 8 ГП участка красок), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000022000474, площадью 0,8146 га, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Индустриальная, д. 5У.

Составные части и принадлежности: асфальто-бетонное покрытие площадью 602 кв. м

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**71 800,00**	**Задаток, руб.**	**7 180,00**

Лот № 2:

1) Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-23990 площадью 178,0 кв. м, (назначение: здание многоквартирного жилого дома, наименование: 4-квартирный жилой дом), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001014055, площадью 0,0547 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Мицкевича, д. 63. Составные части и принадлежности: сарай, уборная

Начальная цена, руб. (без учета НДС)	**186 000,00**	**Задаток, руб.**	**18 600,00**
Условия продажи	Без условий		
Организатор торгов	Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»		
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи		
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245		

Аукцион состоится 26 февраля 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8-(029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 25 февраля 2019 г. до 17.00

*** Участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукционных торгов**

Сіла прывычкі

У пачатку васьмідзесятых гадоў давялося мне па турыстычнай пуцёўцы пабываць у Балгарыі. Група наша, як кажуць, была пярэстая: рознага ўзросту і рознага роду заняткаў людзі падабраліся ў ёй. Большасць аматараў адпачыць у братняй сацыялістычнай краіне, пазнаёміцца з ладам жыцця яе, славутымі мясцінамі і г. д. прыехалі за мяжу ўпершыню. Але не толькі яны, а і тыя, за плячыма якіх былі ўжо круізы па Еўропе, праяўлялі вялікую цікавасць да ўсяго, што яны бачылі на свае вочы, аб чым апавядалі экскурсаводы, бо не заставалася ніводнага пытання, на якое б яны не атрымлівалі грунтоўнага адказу.

Сапраўды, мы многа аб чым даведаліся (напрыклад, што вядомы ва ўсім свеце кіраўнік паўстанцаў рабоў Спартак нарадзіўся на тэрыторыі сучаснай Балгарыі), замацавалі ў сваёй памяці сумеснае змаганне Расіі і Балгарыі супраць турэцкага засілля апошняй, пабывалі ў Сафіі і Габраве, на славутай Шыпцы, ва ўрачыстай маўклівасці пастаялі каля помніка савецкаму салдату Алёшу, адпачывалі на марскім узбярэжжы, дзе на многія кіламетры цягнуцца выдатныя пясчаныя пляжы, якія амываюцца чысцютkай вадой.

А якія выдатныя віны выраблялiся і вырабляюцца зараз у Балгарыі, каньяк «Пліска» і брэндзі «Сонечны бераг». Грэх было не пакаштаваць іх, тым больш што па цане яны былі не такія ўжо недаступныя, нават у кавярні, куды большасць з нас не адмаўлялася заходзіць. Мне неяк кінулася ў вочы, што там я ніводнага разу не бачыў ні Міхаіла Антонавіча, ні Мікалая Сяргеевіча, з якімі ў час турыстычнай вандроўкі зблізіўся. Першы працаваў у Рэчыцы слесарам-рамонтнікам нейкай аўтабазы, а другі — будаўніком у Мазыры. Гадоў па пяцьдзясят кожнаму з іх на той час было. І яны, здавалася, адчувалі сябе крыху адасобленымі ад групы. У Варне, напрыклад, пазнаёміліся яны з мясцовым жыхаром, які выдатна ведаў рускую мову і ў якога былі родзічы ў Бранску, і некалькі дзён (але так, каб гэта не дайшло да кіраўніка групы) рэзаліся ў патаемным месцы ў карты. Забыўшыся, што побач мора, якога ў Беларусі няма.

Дык вось, аднойчы я прапанаваў ім схадзіць у кавярню, выпіць па чарцы водарнай «Пліскі». А яны ў адказ: пайшлі з намі, паважаны таварыш. Куды, пытаю. У нашу кавярню, адказваюць. А дзе яна? На будоўлі. Вядома ж, я адмовіўся. І пасля ўжо, калі рыхтаваліся вяртацца дадому, у Беларусь, пацікавіўся ў іх, чаму культурнаму адпачынку ў камфортным гандлёвым пункце яны аддалі перавагу нейкаму, прабачце, завуголлю, то пачуў наступнае: сіла прывычкі. Будаўнік Мікалай Сяргеевіч пасля работы чарэнцыю з такімі ж, як сам мужыкамі, куляў то ў бытоўцы, то ў нейкім яшчэ нетынкаваным пакоі, а слесар-рамонтнік Міхаіл Антонавіч — таксама ці ў майстэрні, ці ў гаражы.

Аднойчы, праўда, атрымаўся канфуз, аб якім яны расказалі з горкай усмешкай. Адкупорыўшы бутэльку не, не «Пліскі» і не «Сонечнага берага», а нашай савецкай «Сталічнай», якую не паспелі рэалізаваць балгарам, і, падрыхтаваўшы закусь, раптам пачулі нейкі свісток і ўбачылі, як па тэрыторыі будоўлі ў іх бок накіроўваюцца нейкія два чалавекі. У спецформе. Няйначай міліцыянты, мільганула ў галовах турыстаў. Застукаюць — бяды не абярэшся. Штраф упякуць, на прафсаюзным сходзе разборак не пазбегнуць, непрыемнасці будуць несусветныя. Мужыкі паціху задам-задам — ды ходу адтуль праз тую дзірку ў агароджы, у якую раней пралазілі. Калі ж хвілін праз сорак-пяцьдзясят, азіраючыся вакол, вярнуліся, каб пачаць трапезу, то ўбачылі: ні пляшкі, ні закусі...

Шнапс ад палоннага

Летась пазнаёміўся я з былым франтавіком Алегам Назаравічам Пліндовым і неаднаразова меў з ім гутаркі. Так тады і даведаўся, што пасля заканчэння першага курса Магілёўскага педінстытута ў 1941 годзе ён вымушаны быў пачаць свой баявы шлях, закончыўшы яго 7 ліпеня 1944 года, калі пасля цяжкага ранення пад Віцебскам і лячэння яго камісавалі з Чырвонай Арміі. Ветэран Вялікай Айчыннай прайшоў з баямі крывава-вогненнымі дарогамі Заходняга, Калінінскага і 3-га Беларускага франтоў. Яго заслугі перад Радзімай адзначаны двума медалямі «За адвагу», двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалём за перамогу над Германіяй і медалём Жукава.

— Як я выжыў у тым пекле, — гаворыць Алег Назаравіч, — не ведаю. Напэўна, шанцавала. Бо тройчы смерць, як кажуць, прамой наводкай замахвалася на мяне. Першы раз, калі я, старшы сяржант, памочнік камандзіра ўзвода разведкі 195-га гвардзейскага артылерыйскага палка 91-й гвардзейскай Духаўшчынскай стралковай дывізіі дастаўляў важнае данясенне ў штаб палка. Пераходзячы на Валдаі шумлівую рачулку, пасярэдзіне яе адчуў, што нібы спатыкнуўся. Калі ж паблізу распалажэння штаба стаў прыводзіць сябе ў парадак, з жахам убачыў, што на прыкладзе аўтамата расколіна, а на ствале яго адмеціна ад разрыўной кулі нямецкага снайпера.

У адным з баёў за горад Вялікія Лукі Алег з групай разведчыкаў дапамагаў артылерыстам перамяшчаць гармату то ў адно месца на вуліцы, то ў другое, каб тыя білі па ворагу прамой наводкай. У час кароткага адпачынку ў нейкім паўразбураным будынку туды з рэзкім свістам заляцеў, як выявілася пасля, вялікага калібру снарад, які дзеўбануўся ў замерзлую зямлю за некалькі крокаў ад разведчыкаў. Усе ўжо ў думках развіталіся з жыццём. Але снарад, на шчасце, не выбухнуў.

А трэці выпадак адбыўся недалёка ад беларускага гарадка Лёзна. Алегу як старшаму групы было загадана абсталяваць назіральны пункт і сачыць за перамяшчэннем ваеннай тэхнікі ворага па мясцовых дарогах і дакладваць аб гэтым каму трэба. Заняўшы пазіцыю на гарышчы адной з вясковых хат і аддаўшы адпаведныя распараджэнні назіральніку — разведчыку Карпаву (Пліндоў імя яго не памятае) і тэлефаністцы Ліне Альшэўскай, — Алег накіраваўся да крынічкі па ваду. І раптам — гарматны залп. Хата разляцелася ў шчэпкі. Старшага сяржанта моцна кантузіла, і яго на насілках даставілі ў санбат, а Карпаў і Альшэўская загінулі.

— Алег Назаравіч, — кажу яму. — На вайне чаго толькі не адбывалася. А ці даводзілася вам, напрыклад, сустрэцца з ворагам непасрэдна, з вока на вока, ці, скажам, уступіць з ім урукапашную?

— Паўтараю, я быў артылерыйскім разведчыкам і ў рукапашных паядынках не прыйшлося ўдзельнічаць. А калі б здарылася такое, то не спасаваў бы. А вось з адным немцам, як кажуць, па-чалавечы пагутарыў і, што цалкам верагодна, выратаваў яго ад смерці.

— Цікава...

— А было гэта ў Вялікіх Луках. Перад самым Новым, 1943 годам, калі нам давялося выбіваць фрыцаў з кожнага дома, мне на вочы трапіў адзін хударлявы немец, які быў без зброі і нікуды, як астатнія, не збег. Ён стаяў з паднятымі ўгору рукамі. Выгляд у яго быў такі разгублены, і ён так жаласна глядзеў вакол сябе, што я даў рэзкую адмашку нашаму салдату, які ўжо быў гатовы націснуць на курок. Немец, жэстыкулюючы рукамі і тыцкаючы сябе ў грудзі, раз-пораз лапатаў: іх пук-пук ніхт, іх пук-пук ніхт, Гітлер капут, Гітлер капут...

— Я табе, немчура, зараз як пукну, дык у расход пойдзеш, пайшоў на яго ў атаку той самы салдат, але я даў каманду: адставіць! Немец тым часам выняў з кішэні некалькі фотакартак: ён, жонка, двое дзяцей з імі ў зялёным садку, што, напэўна, азначала: ён, мірны чалавек, вайны не хацеў, яго прымусілі, ён не страляў.

— Ва ўсякім разе, — працягвае далей Алег Назаравіч, — мы так яго зразумелі. Немец ведаў некалькі рускіх слоў, я — штосьці разумеў па-нямецку, бо ў школе і інстытуце вывучаў іхнюю мову, і ў час кароткай гутаркі стала вядома, што ён аптэкар, што ваяваць не хацеў, што нікога не забіў. Інтуітыўна я адчуў: чалавек гаворыць праўду. Але цалкам яшчэ не давяраючы яму (а раптам — пераапрануты эсэсавец і некуды выкінуў свой аўтамат), мы прымусілі паказаць тую аптэку. Паказаў. І па дарозе тыцнуў пальцам у бок будынка, што знаходзіўся каля аптэкі, прамовіўшы толькі адно слова: «шнапс». Тлумачыць, што яно азначае, нам не трэба было.

Мы зайшлі на нямецкі харчовы склад. А там — шампанскае, бургундскае, чорт ведае, якія яшчэ алкагольныя напоі і розныя

закусі. Ну, думаем, як па заказе: да Новага года! Адзначым як след яго! Напоўнілі свае ранцы спіртным і ў штаб палка нямала бутэлек адправілі. Пасля ад камісара, праўда, атрымалі прачуханцыю, ды нічога, пранесла. Дарэчы, у штабе размяркоўвалі палонных — каго куды. Дык я каго-нікаго з афіцэраў папрасіў, каб да «майго немца» аднесліся з увагай.

— Прабачце, Алег Назаравіч, за правакацыйнае пытанне: няўжо там, на складзе, ваша група не кульнула чарку? Толькі шчыра...

Былы старшы сяржант, а зараз капітан у адстаўцы ўсміхнуўся:

— Як заўсёды, маніць не буду: «раздавілі» адну пляшку.

— Усяго адну? — засумняваўся я.

— Байцы падбівалі мяне на большае, але я рашуча сказаў: не! Абстаноўка не дазваляе. Прызнаюся, што расчуліў нас немец сваім аповедам і фоткамі так, што кожны салдат абвострана ўспомніў аб сваіх родных, прыгадаў аб тым, што не ўсе ў Германіі фашыстамі з'яўляюцца, і мы гэтаму палонnаму таксама налілі. Не ўяўляю, чым бы ўсё закончылася, калі б аб усім гэтым стала вядома камісару...

Нерат

Гэты мужчына трапіў пад маю ўвагу гады два таму. І не толькі з той прычыны, што вызначаўся ён прыгажосцю, рэдкім высокім ростам і моцным целаскладам, а сваімі незвычайнымі паводзінамі. Прагульваючыся па алеях гомельскага парку, ён, здаецца, не прапускаў ніводнага трох-чатырохгадовага хлапчаняці, якое крочыла ці гуляла побач з мамай. Завядзёнка ў яго была такая. Вітаючыся з імі (з мамай кіўком галавы, а з хлапчуком абавязкова за руку), ён частаваў дзяцей цукеркай, шакаладкай ці абаранкам, гладзіў па галоўцы і, паднімаючы ўгору вялікі палец, узнёсла прамаўляў:

— Мужычок — што трэба! Хай расце здаровенькі і прыгожы! А маме — цэлы воз шчасця!

Пасля такіх дыфірамбаў жанчына як бы разнявольвалася ад будзёных клопатаў, згодна ківала галавой (маўляў, дай божа, каб так і было), а малы (гэта залежала ад яго характару) або насцярожваўся, або чапляўся за руку добрага дзядзькі.

Потым, як правіла, адбываўся шпацыр па сцежках-дарожках з рознага кшталту размовамі. Іншым разам яны насілі жартоўны характар. Напрыклад, Міраслаў Алегавіч (так звалі мужчыну) пытаў:

— А можна, Ігарок (Саша, Сярожка, Арцёмчык), я цябе трошкі... укушу?

— Нельга, — заўсёды адказвалі малыя.

— А маму — можна?

— Таксама нельга, — натапырваліся яны.

У такіх выпадках у мяне ў галаве ўзнікала думка, што дурнейшага жарту і не прыдумаеш. І што мужчына праяўляе асаблівую цікавасць зусім не да хлопчыка, а да яго маладой сімпатычнай мамы, да якой ён «клеіцца», падбірае ключык вось такім макарам. У гэтым, паўтаруся, сумненняў ніякіх у мяне не ўзнікала. Дарэчы, як і ў адной з такіх мам. Забягаючы наперад, скажу, што тут мы абодва памыляліся. Але аб усім па парадку.

Здарылася гэта ў леташнім маі. Да мяне на лаўку прысуседзіўся Міраслаў Алегавіч, з якім раней пры апісаных вышэй выпадковых сустрэчах мы не абмовіліся ніводным словам. Я маўчу. А ён чаўпець пачаў.

— Дурань я дурань! Даўбешка! І яна, Святлана, дурніца. Бяры мяне, кажа...

Грамаў, відаць, чатырыста хлабыснуў, калі сам з сабой размаўляць пачаў, думаю. Ці не лепш мне рэціравацца? Толькі падняўся, як той, напэўна, угадаўшы мой намер, сказаў:

— Пачакайце, бацька. Не п'яны я... На душы моташна... Параіцца хачу...

Так вось нечакана для сябе я стаў слухачом споведзі Міраслава Алегавіча.

Ён вучыўся з Інесай у адным і тым жа ўніверсітэце, і іх двухгадовае сяброўства закончылася вяселлем ужо пасля таго, як жыццё раскінула маладых спецыялістаў па розных гарадах і ён пераехаў да яе ў Гомель. Інеса (і ён цалкам пагадзіўся з ёй) адразу заявіла: дзяцей заводзіць не будзем пяць-шэсць гадоў. У час водпускаў павандруем па розных краінах. Пабачым свет.

Міраслаў (разумна гэта было ці не, ён сам зараз не ведае) заявіў тады так: калі не падорыш мне сына, то... Дагаворваць, што азначае гэтае «то», ён не стаў, а Інеса ўголас разважыла: каго дасць бог, той і будзе. Калі прыйшоў час Інесе «выконваць заказ» мужа, аказалася, што будзе дачушка.

— Колькі ні ўгаворвала мяне жонка, — з сумам апавядаў Міраслаў Алегавіч, — згадзіцца з лёсам, я ўпёрся, як бык, і прымусіў яе пайсці на аборт. Усе далейшыя спробы займець дзіця цягам сямі гадоў заканчваюцца няўдачай. Надзей на пазітыўныя змены — нуль. Інеса страшэнна нервуецца, я — таксама і па-ранейшаму мару пра сынка, адсутнасць якога, калі можна так сказаць, употай ад жонкі кампенсую пяшчотай да чужых хлапчукоў.

— А мне падалося, што да іхніх мам... — не ўстрымаўся я.

— Во, і Святлана так думае. Убіла сабе ў галаву, што я закахаўся ў яе і ніяк не асмелюся прызнацца ў гэтым. Дык сама сёння пайшла на такі крок. Сэрца па мне, кажа, у яе разрываецца. Дык не валяй ваньку, кажа, бяры мяне з Віцьком, якога, прызнаюся, я вельмі палюбіў. Яна ж не ведае, што я жанаты, што вельмі кахаю Інесу, перад якой вінаваты і якую ні на кога іншага мяняць не збіраюся. Нават на яе, Святлану, якая мне падабаецца. Дурань я дурань. Да чаго жанчыну давёў. Дык што мне рабіць, бацька?

Параіць нешта Міраславу Алегавічу тады, у маі, я не змог. Бо лічыў і лічу зараз так: калі чалавек сам загнаў сябе ў нерат, дык сам адтуль і вылезе. Пасля дэталёвых аналізаў абстаноўкі і разваг. Так, думаю, было і гэтым разам. Зусім нядаўна, у верасні, калі Гомель святкаваў дзень горада і праводзіў харэаграфічны фестываль «Сожскі карагод», я ў тым жа парку ўбачыў Міраслава Алегавіча. Абшчапіўшы шыю, у яго на плячах сядзеў гарэза-хлапчук, а ў руку ўплялася такога ж узросту дзяўчынка. Побач была не знаёмая мне прывабная жанчына. Хто яна, заставалася загадкай нядоўга. Бо нейкі мужчына, праходзячы з напарніцай міма, прамовіў:

— Бачыш, Люба, у Сідаравых «вайна» закончылася. Двайнятак з дзіцячага дома ўзялі... Шчасця ім.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Спорт-тайм

ФРЫСТАЙЛ, ВЕЛАСПОРТ, БІЯТЛОН...

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя важныя і значныя падзеі выхадных.

1. ***Велагоншчык Раман Цішкоў заняў другое месца на этапе Кубка свету на велатрэку ў Кембрыджы (Новая Зеландыя).*** Сярэбраную ўзнагароду беларус выйграў у адной з самых складаных дысцыплін — омніуме. Па выніках чатырох гонак Раман Цішкоў набраў 112 ачкоў. Усяго толькі на адзін бал апярэдзіў беларуса швейцарац Клаўдыа Імхоф — 113 балаў. Заключны этап Кубка свету па веласпорце на трэку пройдзе з 25 да 27 студзеня ў Ганконгу.

2. ***Антон Кушнір заняў восьмае месца на першым этапе Кубка свету ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе па фрыстайле (лыжная акрабатыка).*** Перамог расіянін Максім Бураў.

Астатнія беларусы размясціліся ніжэй: Павел Дзік заняў 10-е месца, Максім Гусцік 11-ы ў выніковым пратаколе, Дзмітрый Мазуркевіч заняў 12-ю пазіцыю.

У спаборніцтвах сярод жанчын увесь п'едэстал занялі прадстаўніцы Кітая, перамогу святкавала Ксю Ментаа. Беларуска Аляксандра Раманоўская паказала 15-ы вынік.

Наступным буйным стартам для беларускіх лыжных акрабатаў стане чэмпіянат свету, які пройдзе з 5 па 7 лютага ў амерыканскім Дзір-Вэлі.

3. ***Валейбалісткі «Мінчанкі» перамаглі ў гасцях «Сахалін» з лікам 3:1 у 13-м туры расійскай суперлігі.*** Адзначым, што раней у Мінску валейбалісткі «Сахаліна» былі мацнейшыя 3:2.

У актыве «Мінчанкі» ў турнірнай табліцы чэмпіянату стала трынаццаць ачкоў. У 14-м туры 27 студзеня падапечныя Віктара Ганчарова прымуць на сваёй пляцоўцы казанскае «Дынама».

4. ***Ірына Крыўко заняла шостае месца ў мас-старце на пятым этапе Кубка свету ў Рупольдынгу.*** Выйграла гонку немка Францыска Пройс. У мужчынскую гонку з масавым стартам беларусы не трапілі.



Шосты этап Кубка свету па біятлоне пройдзе 24—27 студзеня ў італьянскім Антхольцы, дзе будуць разыграны ўзнагароды ў спрынце, гонках пераследу і з масавага старту.

5. ***Арына Сабаленка і бельгійка Элізэ Мертэнс не здолелі выйсці ў чвэрцьфінал парнага разраду адкрытага чэмпіянату Аўстраліі па тэнісе.*** Беларуска-бельгійскі тандэм у 1/8 фіналу прайграў чэшкам (Барбара Крэйчыкава / Кацярына Сінякова) — 6:2, 2:6, 3:6.

Раней з барацьбы ў парным разрадзе вылецела і Аляксандра Сасновіч.

6. ***Гулец хакейнага мінскага «Дынама» Крысціян Хенкель набраў чатыры ачкі (два галы і два выніковыя пасы) у Матчы зорак КХЛ у Казані.*** Абаронца «зброю» для ўдзелу ў хакейным шоу быў абраны лігай.

Крысціян Хенкель выступіў за каманду дывізіёна Тарасава, якая заняла чацвёртае месца. Таксама абаронца паўдзельнічаў у двух конкурсах — эстафета майстэрства і хакейны біятлон.

Матч зорак КХЛ праводзіўся 11-ы раз. Нагадаем, у 2010 годзе хакейнае шоу прымала «Мінск-Арэна».

7. ***Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» прайгралі аднаму з фаварытаў Адзінай лігі ВТБ падмаскоўным «Хімкам» — 50:70.*** Паражэнне стала першым для новага галоўнага трэнера мінчан Расціслава Вергуна.

У гэтым сезоне мінскія «цмокі» перамаглі ўсяго двойчы ў 13 праведзеных сустрэчах і займаюць апошняе, 14-е, месца ў турнірнай табліцы.

Тры наступныя матчы «банкаўскага» турніру чэмпіёны Беларусі правядуць у Мінску. 27 студзеня сустрэнуцца з лідарам — маскоўскім ЦСКА. 2 лютага згуляюць з казанскім «Уніксам». А 10 лютага будуць змагацца ў паядынку з «Зенітам» з Санкт-Пецярбурга.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.12	17.31	8.19
Віцебск —	9.08	17.14	8.06
Магілёў —	9.02	17.21	8.19
Гомель —	8.52	17.24	8.32
Гродна —	9.26	17.47	8.21
Брэст —	9.20	17.54	8.34

Месяц

Поўня 21 студзеня. Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Піліпа, Пятра.*
К. *Анастасіі, Вікторыі, Віктара, Вінцэнта, Дамініка, Мацея.*

Фота Алены ДАЎЖАНОК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Людзі! Калі вы калі-небудзь убачыце, як падае з паліцы кактус, — НЕ ЛАВІЦЕ ЯГО! Хай сабе падае... гад зялёны.

— Чым зараз займаешся?

— Аптымізацыяй сваіх выдаткаў.

— Звальняеш лішніх супрацоўнікаў?

— Не, разыходжуся з палюбоўніцай, разводжуся з жонкай.

Вясковая мудрасць.

Калі ваша дачка не прыйшла начаваць, раніцай на вышках акуратней шуруйце віламі.

— Па якіх прычынах мужчына ходзіць на стрыптыз?

— Першая — мужчына не жанаты, другая — мужчына жанаты.



caricatura.ru

Даты Падзеі Людзі

22 СТУДЗЕНЯ

У краіне

974 год — згодна з Віцебскім летапісам, кіеўскай княгіняй Вольгай заснаваны Віцебск (летапісны Видбеск, Видебск, Витепеск, названы так ад р. Віцьба, на беразе якой ён паўстаў). Як паселішча крывічоў існаваў з IX стагоддзя. Розныя пісьмовыя крыніцы называюць дзве даты, якія могуць лічыцца датамі першага згадвання пра горад — 974 год фігуруе ў рукапісах Міхаіла Панцырнага, 1021 год — у старажытнарускіх летапісах.

1861 год — нарадзіўся (г. Магілёў) Уладзімір Піліпавіч Горын-Галкін, удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Расіі, філосаф-марксіст. У 1882 годзе за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў выключаны з Харкаўскага ветэрынарнага інстытута. Стварыў рэвалюцыйныя гурткі ў Сімферопалі, Адэсе. У 1887 г. быў арыштаваны і сасланы на 10 гадоў у Верхаянск. Удзельнік Сібірскага сацыял-дэмакратычнага саюза, працаваў у сацыял-дэмакратычных арганізацыях Растова-на-Доне, Баку, Тыфліса, Кутаісі. Супрацоўнічаў у газеце «Искра». Дэлегат II з'езда РСДРП (1903), бальшавік. Пасля з'езда застаўся за мяжой. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года вярнуўся ў Расію. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні Кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Адзін з арганізатараў Народнага камісарыята замежных спраў РСФСР. З 1918 года быў на кіруючай ваенна-палітычнай рабоце ў Чырвонай Арміі і на навукова-педагагічнай рабоце ў Маскве. Памёр у 1925 годзе.

1906 год — нарадзіўся (г. Мінск) Андрэй Аляксандровіч, беларускі паэт, празаік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1936 г.). Адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929—1931 гадах намеснік дырэктара Белдзяржкіно, у 1934—1937 гадах — намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1934 годзе ў часе ўрачыстай сустрэчы савецкага астранома і геафізіка Ота Шміта на вакзале ў Мінску прачытаў верш са словамі «Хай будзе слаўны горад Шміт!», у якім прапанаваў перайменаваць Магілёў. У 1938 годзе арыштаваны і асуджаны. Рэабілітаваны ў 1955 годзе. Аўтар паэтычных зборнікаў «Па беларускім бруку», «Прозалаць», «Фабрыка смерці» і інш. Многія творы прысвечаны подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай вайне, барацьбе за мір. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Пушкіна «Руслан і Людміла», асобныя творы Д. Беднага, М. Ісакоўскага, А. Суркова і інш. Памёр у 1963 годзе.

У свеце

1724 год — Пётр I выдаў указ аб абавязковасці ведання службовымі асобамі дзяржаўных устаноў законаў і пастаноў і аб забароне апраўдвацца няведаннем законаў пад штрафам за іх невыкананне.

1904 год — нарадзіўся Аркадзь Пятровіч Гайдар, савецкі пісьменнік. У гады грамадзянскай вайны ў 15 гадоў камандаваў ротай, у 17 — палком. У Вялікую Айчынную вайну быў карэспандэнтам газеты «Комсомольская правда». Пісаў для дзяцей. Аўтар кінасцэнарыяў «Цімурава клятва», «Камендант снежнай крэпасці». Загінуў на фронце ў 1941 годзе.



1905 год — царскія войскі расстралялі ў Пецярбургу дэманстрацыю рабочых. Гэты расстрэл увайшоў у гісторыю пад назвай «крывавай нядзелі». Гэта стала пачаткам першай рэвалюцыі ў Расіі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 143. Нумар падпісаны ў 19.30 21 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12